# Якуб Колас аб сродках фарміравання свядомага чытання

## Філасофска-педагагічныя погляды класіка беларускай літаратуры на месца і ролю кнігі ў сацыялізацыі і інкультурацыі школьнікаў



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

**Сутнасць чытання, яго ролю і месца ў сацыялізацыі і інкультурацыі школьнікаў вельмі грунтоўна вызначыў народны паэт Беларусі Якуб Колас. У 1925 годзе ён заканчвае працу над буйным дыдактычным творам «Методыка роднай мовы», дзе паказвае, «як трэба весці навучанне роднай мове, каб яно было паспешным і навукова правільным» [6, с. 317]. Прааналізаваўшы ў гістарычным ракурсе мноства існуючых у еўрапейскіх краінах метадаў навучання мове, пісьменнік прыходзіць да высновы, што «лепшым метадам трэба прызнаць такі метад, каторы не гвалтуе дзіцячай прыроды, а ідзе на спатканне яе патрэбам» [6, с. 348].**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### «Адзіны сродак самаасветы»

Асобны раздзел у «Методыцы роднай мовы» Якуб Колас прысвячае ролі і месцу чытання і наогул ролі кнігі ў працэсе інкультурацыі асобы. Чытанне, на думку класіка нашай літаратуры, з'яўляецца «адзіным сродкам самаасветы», спосабам, якім вучні могуць «папаўняць свае веды незалежна ад дапамогі настаўніка», «разбірацца ў тым матэрыяле, што дае кніга» [6, с. 396]. Аўтар дыдактычнай працы быў перакананы: чытанне каштоўнае тымі перажываннямі асобы, што выклікаюцца літаратурнымі вобразамі, якія «падымаюць, узвышаюць і крышталізуюць дух дзіцяці» [6, с. 402].

Пісьменнік разглядаў чытанне мастацкіх твораў як найважнейшы элемент выхавання ў шырокім сэнсе слова. Выходзячы з гэтай пазіцыі, ён распрацоўвае методыку чытання, дзе прапаноўвае беларускім педагогам шэраг дыдактычных спосабаў-прыёмаў, з дапамогай якіх можна выпрацаваць у школьнікаў навыкі і ўменні, неабходныя для чытання. Значную ўвагу надае Якуб Колас аналізу псіхафізічных працэсаў, якія ўзнікаюць падчас чытання. Псіхалогія чытання ім аналізуецца адпаведна асноўным палажэнням вядомых канцэпцый, распрацаваных еўрапейскімі навукоўцамі Д. Локам, В. Ікельзамерам, Г. А. Салісам, Ж. Жакато, К. Шмітам і інш. Пры вызначэнні псіхалагічных асноў розных відаў чытання пісьменнік выкарыстоўвае багатую педагагічную спадчыну рускіх вучоных П. А. Афанасьева, К. Д. Ушынскага, А. А. Фартунатава, Л. І. Цімафеева і інш.

Псіхалогію чытання Колас разглядаў у шырокім і вузкім сэнсах. У вузкім сэнсе ўяўляў яго як працэс навучання чытанню пэўных тэкстаў. Але, на думку Коласа, «усвоіць самы працэс чытання яшчэ не значыць навучыць дзяцей чытаць у шырокім значэнні» [6, с. 396]. У шырокім значэнні мэта навучання чытанню, паводле сцвярджэння аўтара дыдактычнага твора, заключаецца ў тым, каб развіць у дзяцей навыкі свядомага самастойнага чытання. Пісьменнік уводзіць тэрмін «надворныя і ўнутраныя якасці чытання». Пад надворным чытаннем ён разумее бегласць і правільнасць. Бегласць чытання заключаецца, па меркаванні Коласа, у хуткім

ахопліванні вачыма літарнага складу слова і пераводу яго ў гукі. Пад правільнасцю аўтар разумее чыстае вымаўленне гукаў у складзе слова, у пэўным парадку, без усялякіх пропускаў, перастановак і замен аднаго гука другім. Да надворных якасцей чытання Якуб Колас адносіў таксама і яго выразнасць. «Выразнасць чытання, – пісаў ён, – адзін са сродкаў для зразумення чытанага і для лагічнай работы над тэкстам» [6, с. 398]. Пісьменнік лічыў, што выразна прачытаны твор і ўспрымаецца лепш, і мацней адбіваецца ў памяці, стварае большае эстэтычнае ўражанне.

Унутранай якасцю чытання, на думку Якуба Коласа, з'яўляецца яго свядомасць. Свядомае чытанне аўтар разумеў як уменне хутка ўлоўліваць падчас чытання і асобныя меркаванні, і сам ход думкі, і яе значэнне. Свядомасць ён уяўляе як унутраную якасць чытання. Свядомаму чытанню Якуб Колас процiпастаўляў механічнае чытанне, «калі вучань правільна вымаўляе словы, але не злучае з імі значэнняў, не разумее таго, што чытае» [6, с. 398]. Пісьменнік арыентаваў беларускіх педагогаў на дзейнасць па навучанню школьнікаў свядомаму чытанню, якое фарміруецца «спосабам мнагалікіх і доўгіх практыкаванняў пры дапамозе настаўніка і пад яго кіраўніцтвам» [6, с. 396].

### Патрабаванні да тэкстаў, якія прапануюцца дзецям

Асобнае месца ў «Методыцы роднай мовы» займае раздзел, у якім Якуб Колас разглядае сродкі фарміравання свядомага чытання. Кампаратыўны аналіз пісьменнікам дыдактычных метадаў навучання чытанню, якія на той час існавалі ў педагагічнай практыцы, дазволіў яму арыентавацца на «аб'яснялыіае чытанне» – дыдактычныя метады, якія спрыяюць разуменню таго, што чытаецца. Перавагу гэтаму метаду Колас аддаваў таму, што ён «дае вучням магчымасць набыць адзін з навыкаў чытання, навык чытаць свядома» [6, с. 401]. Пісьменнік тлумачыў педагогам, што «аб'яснялыіае чытанне» адыгрывае вядучую ролю на першапачатковым этапе навучання, пакуль дзеці не навучацца чытаць удумліва, але пасля гэтага яно паступова павінна скарачацца па часе і спалучацца з іншымі метадамі і формамі работы. Якуб Колас прапаноўвае настаўнікам таксама шэраг заданняў для ўрокаў «аб'яснялыіага чытання». Увагу педагогаў ён засяроджвае на актыўным удзеле саміх вучняў у чытанні. Выразнае чытанне настаўніка не павінна замяняць чытання ўголас дзяцей. У ім, паводле пераканання пісьменніка, абавязаны прымаць удзел вучні ўсяго класа – па чарзе. Чытаць тэкст Колас прапаноўваў як па частках, так і ўвесь цалкам. Вельмі важна, каб настаўнік у працэсе чытання не пакідаў без увагі незразумелыя дзецям словы або часткі тэксту. У той жа час аўтар дыдактычнай працы папярэджваў педагогаў, што тлумачэнне не павінна засланяць самога чытання: «Усякае аб'ясненне павінна быць кароткім, немнагаслоўным» [6, с. 407].

Якуб Колас быў перакананы, што эфектыўнасць працэсу навучання чытанню ў многім «залежыць не толькі ад спосабаў чытання, але і ад самога матэрыялу» [6, с. 402]. Пісьменнік вызначыў важнейшыя патрабаванні да тэкстаў, якія прапаноўваюцца дзецям для чытання. Па-першае, твор павінен быць цікавым для юных чытачоў і выклікаць у іх ахвоту да чытання. Па-другое, чытанка павінна ўтрымліваць пэўныя веды. Па-трэцяе, тэкст, які даецца для чытання, «павінен закранаць у дзяцей лепшыя струны іх, развіваць успагаднасць, гатоўнасць стаяць за грамадзянскія ідэалы. Ён павінен выхоўваць спачуванне, маральную чуласць» [6, с. 403]. Колас не раіў педагогам прапаноўваць вучням у якасці чытання вершаваную і навукова-папулярную літаратуру. Творы для чытання школьнікаў, на яго думку, павінны быць напісаны спецыяльна. Праблему стварэння кніг для дзяцей і падлеткаў пісьменнік неаднаразова ўздымаў у публіцыстычных артыкулах. Так, у артыкуле «Быть гражданином» Колас, аналізуючы тагачасную школьную праграму, адзначаў, што ў адлюстраванні гісторыі беларускай культуры маецца шэраг недахопаў, адсутнічаюць добрыя падручнікі. Ён падкрэсліваў: «Хорошая хрестоматия, в которой умело подобраны наиболее характерные произведения, правильно отражающие развитие белорусской культуры и литературы, – фактор первостепенного значения в воспитании молодого поколения» [6, с. 28]. Гэтае ж пытанне абвострана ставіў пісьменнік і ў «Прамове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі» [6, с. 231–235]. Дарэчы, менавіта з улікам стымулявання эмацыянальнай і крэатыўнай дзейнасці вучняў пабудаваў Якуб Колас і свой вядомы твор «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», які з'явіўся ў друку ў 1910 годзе [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кампаратыўны аналіз прац К. Д. Ушынскага «Роднае слова» [8] і «Дзіцячы свет» [9], Э. Пашкевіч (Цёткі) «Першае чытанне для дзетак беларусаў» [10] і Якуба Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» паказвае, што Колас у многім быў пераемнікам названых аўтараў. Яго яднала з Ушынскім і Цёткай усведамленне выключнай важнасці роднай мовы, вуснай народнай творчасці, прыроды ў фарміраванні светапогляду асобы. Чытанкі Коласа і Цёткі абапіраюцца на народныя традыцыі, на фальклор, на вопыт народнай педагогікі. Творы, уключаныя пісьменнікам у чытанку, па жанры даволі разнастайныя: апавяданні, замалёўкі, нарысы, казкі, вершы, байкі. Колас адухаўляе кожную прыродную з'яву, раскрывае юнаму чытачу прыгажосць усяго існага, імкнецца перадаць сваё пачуццё радаснага светаўспрымання. Нам падаецца, што праблемы прыроды, побыту, маралі ў гэтай кнізе распрацаваны пісьменнікам з культуралагічнай заглыбленасцю, на высокім тэарэтычным і дыдактычным узроўнях. Лексічную аснову пейзажных малюнкаў у «Другім чытанні» стварае лексіка, якая абазначае прыродныя рэаліі. Пры адсутнасці асаблівай экспрэсіі яна вызначаецца багаццем фарбаў і адценняў, тэматычнай разнастайнасцю. Кожнае слова-дыскурс у аўтарскім кантэксце раскрывае дзецям свае нябачныя, стоеныя сілы, дзякуючы ўмеламу выкарыстанню, спалучальнасці і ўзаемасувязям з іншымі словамі.

## Да роднай літаратуры праз родную мову

Вельмі важнае, на наш погляд, меркаванне Якуба Коласа, што чытанне павінна спалучацца з навучаннем роднай мове. Такое ж меркаванне, дарэчы, абгрунтаваў вядомы прадстаўнік французскага постструктуралізму Р. Барт, які лічыў, што тэкст патрабуе, каб мы імкнуліся да скарачэння дыстанцыі паміж пісьмом і чытаннем, аб'ядноўвалі чытанне і пісьмо ў адзінай знакавай дзейнасці [1, с. 420]. Аналіз публіцыстычных твораў Якуба Коласа дае падставу для высновы, што ён надаваў выключную ролю ў фарміраванні этнічнага светаадчування асобы беларускай мове як ядру культуры. У артыкулах «З поваду майго юбілею» [6, с. 87–90], «Литературная учеба» [5, с. 114–116], «Мова М. Лынькова па раману «На чырвоных лядах» [5, с. 154–157], «Шануйце і любіце сваю родную мову» [6, с. 25–26], «Развіваць і ўзбагачаць літаратурную мову» [6, с. 132–136] і інш. пісьменнік сцвярджае, што мова – гэта асноўны вынік і сродак культуры, матэрыялізаванае думанне, выяўленне ступені развіцця нацыі. Паводле пераканання класіка нашай літаратуры, мова выступае ў якасці фактару найлепшага развіцця асобы, важнейшай ўмовы гарманічнага існавання чалавека. «Роднае слова, – адзначаў Колас, звяртаючыся да беларускіх школьнікаў, – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. Пагэтаму вам неабходна так старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць лепшыя творы беларускай літаратуры» [6, с. 26]. Лейтматывам у коласаўскай творчай спадчыне праходзіць думка аб тым, што без роднай мовы адбываецца дэградацыя асобы і грамадства, занядбанне іх інтэлектуальнага, творчага, маральнага патэнцыялу.

Спасціжэнне мовы асобай, дарэчы, як і ўвесь працэс інкультурацыі, на думку Якуба Коласа, павінен быць у цэнтры ўвагі нацыянальнай школы. Філасофска-педагагічны погляд на месца і ролю школы, змест, формы і метады яе дзейнасці ён, былы настаўнік, акрэсліў у трылогіі «На ростанях», шэрагу публіцыстычных твораў. Праблемы беларусізацыі школы разглядаюцца пісьменнікам у артыкулах «Слуцкія курсы» [5, с. 29–31], «Школа і дарожнае будаўніцтва» [5, с. 61–63], «Нашы савецкія дзеці» [5, с. 218–220], «Задачы савецкай школы» [6, с. 39–42] і інш. У гэтых артыкулах Якуб Колас выказваўся за пашырэнне сферы ўжытку беларускай мовы, наданне ёй не толькі дзяржаўнага, але і мажарытарнага статусу. Пісьменнік пераканаўча паказвае месца роднай мовы ў працэсах мыслення школьнікаў, разумення імі з'яў культуры. Па меркаванні Коласа, мова «дае разуменням і ўяўленням, з якімі мае дачыненне мысленне, слоўныя значэнні. Без падтрымання словам наша мысленне было б перарваным і нячоткім» [6, с. 318]. У сувязі з гэтым першачарговай задачай школы, пераконвае нас пісьменнік, з'яўляецца навучанне роднай мове. Акрамя навукова-тэарэтычнага абгрунтавання ролі мовы ў інкультурацыі асобы, Якуб Колас прадпрымае шэраг практычных крокаў па выяўленні ўмоў, спосабаў, метадаў і форм навучання беларускай мове. У «Методыцы роднай мовы» былы настаўнік паказвае, «як трэба весці навучанне роднай мове, каб яно было паспешным і навукова правільным» [6, с. 317].

Такім чынам, на падставе тэксталагічнага аналізу твораў Якуба Коласа можна прыйсці да высновы, што народны пісьменнік неабвержна даказаў выключнае значэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культуры чытання для фарміравання такіх якасцей асобы, як любоў да Радзімы, гуманнасць, праўдзівасць, цвёрдая воля і характар, эстэтычнае пачуццё. Коласаўская парадыгма выхавання культуры чытання ў ключавых сваіх палажэннях не састарэла і сёння і, думаецца, заслугоўвае творчага асэнсавання сучаснымі беларускімі педагогамі.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Барт, Р.** Избранные работы: Семиотика. Поэтика / Р. Барт; общ. ред. и вступ. ст. Г. К. Косикова. – М.: Изд. групп. «Прогресс», «Универс», 1994. – 616 с.
2. **Библиотечный Давос** – 2009 // Библиотечное дело. – 2009. – № 1. – С. 10–15.
3. **Бородина, В. А.** Психология чтения / В. А. Бородина. – СПб.: Санкт-Петербургская государственная академия культуры, 1997. – 78 с.
4. **Колас, Я.** Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас. – СПб.: Выд. суполкі «Загляне сонца і ў нашэ ваконцэ», «Наша хата», 1910. – 112 с.
5. **Колас, Я.** Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1976. Т. 11: Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1917–1946 гг. – 424 с.
6. **Колас, Я.** Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1976. Т. 14: Публіцыстыка і крытычныя артыкулы 1947–1956 гг. – 528 с.
7. **Снапкоўская, С. В.** Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі. З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск, 1995. – 219 с.
8. **Ушинский, К. Д.** Родное слово: книга для детей и родителей / К. Д. Ушинский; сост. Н. Г. Ермолина. – Новосибирск: Магнезия: Дет. лит., 1999. – 448 с.
9. **Ушинский, К. Д.** Детский мир: для детей, родителей и педагогов: в 2 ч. / К. Д. Ушинский. – М.: Лествица, 2000. – 193 с.
10. **Ciotka.** Pierszaje czytanne dla dziatak bielarusou / Ciotka. – Pieciarburh: Drukarnia Piantkouskaha, 1906. – 32 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ